Марыя Шаўчонак

Бацькоўскае імя



Марыя Шаўчонак

БАБЬКОЎСКАЕ ІМЯ

Вершы



МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1981

Бел 2
Ш 29

Ш $\frac{70403-028}{М 302(05)-81}$ 59—81 4702120200

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1981.

МАЯ РАДЗІМА

Яна мне дадзена адзіная
На ўсё жыццё, на цэлы век.
Мая адзіная, радзімая
Ў вянках лясоў і стужках рэк.
Заўсёды самая прыветная,
Як сонца, свецiцца сама,
Жыве, як мара запаветная,
І роўных ёй — нідзе няма.

Яе праменнямі сагрэтая,
Наліта сілай маладой,
Іду, нястомная, па свету я
Яе часцінкаю жывой.

І ганаруся ўсюды смела я,
Што вырасла на той зямлі,
Якую клічуць Руссю Белаю,
Што тут дзяды мае жылі.

* * *

Крынічка нясе гаючая
Аж да ракі імклівай
Мудрасць сваю неўміручую:
Будзь да людзей цярплівай.

Ласкай мы ўсе багатыя,
Не пашкадуйце слова.
Бяссмертнае слова — крылатае,
У кожным — свая аснова.

Трэба сказаць яго, роднае,
Каб пасвятлела ў сэрцы.
Слова бывае living,
Шчыраму толькі верце.

Не зачапіце колкае,
Не патрывожце збалелае,
Не абмініце горкае,
Але праўдзіва-смелае.

Лішняя слодыч — з гаркотаю,
Не трэба яе, бяскрылай.
Слова ўслых і ўпотай
Валодае дзіўнай сілай.

БАЦЬКОЎСКАЕ ІМЯ

Сцвярджаць, вядома, не бяруся,
Што след вядзе ад тых імён,
Але асілкі Белай Русі
Былі вядомы з даўніх дзён.
Ці не таму ад слова «сіла»
Маё бацькоўскае імя,
Хоць не арала, не касіла
І як былінаачка сама?
Хоць зведаць выпала нямала
Выпрабаванняў і трывог,
Ды я ніколі не шукала
Лягчэйшых сцежак і дарог.
Мне слову бацькаваму здрадзіць
Ні час, ні гонар не даюць.
І на зямлі яго, бы ў садзе,
Праз вёсны жаўранкі пяюць.

СВІЦЯЗЬ

Над самым берагам сасна
Стаіць, пахіленая нізка,
Што назаўсёды ў маіх снах
Сяброўкай самаю найблізкай.
Нам з ёй так хораша было
Маўчаць і радавацца лету,
Якое побач расцвіло
Такім багатым першацветам.
Гудзелі весела чмялі,
І сэрца ўдзячна спазнавала
Святое месца на зямлі,
Якому ў свеце роўных мала.
Я палюбіла назаўжды
Ўсё, што радавала вока:
То дрэў спаважныя рады,
То зелень завадзі далёкай.
О, Свіцязь светлая, скажы,
Скуль хараство тваё і сіла,
Што так праменяцца ў душы
І што хвалююць гэтак шчыра!

* * *

Жыццё і радуе, і кліча
На безліч ранніх галасоў
Сваім прасветленым абліччам
Лугоў зялёных і лясоў.

Ніколі не згадзіцца сэрцу,
Няхай і боль у ім, і цень,
Што ўсё пакінуць давядзецца
У нейкі час, у нейкі дзень.
Таму бунтуе гэтак, можа,
Калі хачу яго стрымаць.
За дзень загублены мой кожны
Ніяк не можа даравацъ.
І недарэмна бачым неба
У нашых снах ад веку ў век.
Палёту вечную патрэбу,
Як шчасця просіць чалавек.

ЗЯМЛЯ МАЯ

Зямля мая, якое шчасце,
Што над табой такі спакой,
Што да цябе магу прыпасці,
Пагладзіць ласкава рукой.
Што васілёк твой сінякрылы
І спеласць шчодрая суніц
З такой жывой, гаючай сілай
Перад табой схіляцца ніц.
Ва ўсіх кутках звініць вясёлка,
Кіпіць нястомнае жыццё.
Спяшаюць мурашы і пчолы
На новых даляў адкрыццё.
Як рады ўсе сваім палянам,
Як рады ўсе сваім лясам.
І кожны як зачараваны,
Калі з прыродай — сам-насам.

* * *

Зайздрошчу дрэвам, іх развазе.
Яны стаяць перада мной
У ненатольнай вечнай празе
Быць непарыўнымі з зямлёй.
Бярозкі белыя на ўзгорку
І кучаравы горды клён
Вядуць шчаслівую гамонку
Яшчэ з маіх дзіцячых дзён.
А соснаў стройная узнёсласць,
І строгасць стрыманых ялін,
Падлескаў сонечная роснасць
Ды зорнасць ветлівых калін,—
Такое ўсё — не наглядзецца,
Такое ўсё, што не ўявіць,
Калі б адняць яго ад сэрца,
То як магло б яно пражыць!
І дзе яму было вучыцца
Добразычлівасці сяброў,
Каб не магло не прычасціцца
Да родных пушчаў і бароў.

ІМГНЕННЕ

Чалавек пачынаецца з учынкаў

Між незлічоных пакаленняў,
Між будучым і між былым
Жыццё маё — адно імгненне,
І я штодня ў імгненні тым.
Паўней, глыбей мне праявіцца,
Ва ўчынках выказаць душу,

І растварыцца ў іх,
І зліцца
З усім, што я ў сабе нашу,—
У гэтым бачу сэнс адзіны,
Калі ў раздумлівых начах
Усходзяць кветкамі гадзіны
І адцвітаюць на вачах.

МАЛАДЗІК

Ледзь толькі душой дакрануся
Да белых пялёсткаў вясны,—
Плывуць, нібы з выраю гусі,
Абуджаных мар галасы.

З надзеяй адчынены дзверы,
І шчасцем — сярпок маладым.
Захочацца гэтак паверыць,
Што к лепшаму ўсё сапраўды.

Жаданае, як таямніца,
Не можа ў спакоі трываць.
А дзе яна, тая сініца,
Якую ў руках не ўтрымаць?!

БЕЛЫ ВЕТРАЗЬ

Шчымліва, радасна і светла,
Як сонца, выплыў першы гук.
Удалеч рвецца белы ветразь,
Дзе шчасце стрэч і боль разлук.

Ці разгадаю гука сілу,
Яго таемнасць і красу?
Хоць на яго ўзлятаю крылах
І ўсю душу яму нясу,

Хоць адчуваю: неаддзельна
Я ад яго, ён ад мяне,
Сваім стотысячным адценнем
Ён найсвяцейшае кране.

Кране і велічна расквецідь,
І падабрэе цэлы свет.
У кожным сэрцы зоркай свецяць
Мастак, музыка і паэт.

* * *

А вы мяне паклічце, сосны,
У свой цяністы карагод,
Там, дзе майго юнацтва вёсны
І ні хмурынкі цэлы год.

Я вас пакінула часова,
Згубіла сцежку на бяду,
Паклічце — ўсё пачну нанова,
Усё пакіну і прыйду.

Не разлучуся больш ніколі
І буду з вамі цэлы век,
А дзе знайсці найлепшай долі,
Чым там, дзе вырас чалавек?

* * *

Вясны і лета летуценне,
Лугоў някошаных цвіценне,
А побач сінія лясы,
Дзе дыванамі — верасы.

Ўсё перавязана вянкамі
І пераплецена вякамі,
Зямлі вялікай неўміручасць —
Яе напеўная гаючасць.

* * *

Яшчэ спяваюць
Скрыпкі і кларнеты,
Сугучныя
Вясенняй цеплыні.
Успыхваюць іх зорныя агні
Хвалюючай
Бяскрайнасцю Сусвету.

Як можна жыць
У дробязі ці зле,
То крыўды ўспамінаць свае,
То здрады,
Калі душа
Харошай песні рада
І сінім птушкам —
Кветкам на стале.

СЛЯДЫ ЧУРЛЁНІСА

Крыжоў Жымайційскіх калючыя пікі.
Сосны пад ветрам у шэрані хмар,
І над усім гэтым вечным, вялікім
Белым агеньчыкам — праблiскі мар.

Колькі ў задумы твае ні ўглядацца,
Колькі ў прадонне вачэй ні глядзець,
Не перастану шчасліва здзіўляцца,
Шчыра і ўдзячна душой багацець.

Хай жа, нарэшце, прачнуцца парывы,
Тыя, што дрэмлюць у сховішчах год.
Слухаю прагна твой голас шчаслівы,
Стоены ў фарбах і ў плаўнасці нот.

Ён, незабыўны, пакліча на роздум,
Да ачышчэння ад дробязных мэт.
Хай жа напомніць аб добрым і розным
Твой непаўторны, хвалюючы след.

* * *

Садамі белымі, маўклівымі
Зямля асветлена, як шчасцем.
І нават зоркі зіхатлівыя
У гэту ноч баяцца ўпасці.

Маладзіковай яснай шчодрасцю
Душа напоўнена да краю,
І з нечаканай юнай лёгкасцю
Яна, крылатая, ўзлятае.

А недзе там, за зорным полагам,
Само спаўняецца нязбыўнае.
Успыхвае шчаслівым сполахам
Усё, што з марай непарыўнае.

Размыты межы фантастычнага,
Амаль няма мяжы рэальнага.
Ірвуцца за парог прывычнага
Загадкавыя далі дальнія.

А гэта ноч маладзіковая
Сама сабе ва ўсім здзіўляецца,
Усё ўспрымаецца як новае,
І гэтак многа абяцаецца!

АДВЕЧНАЯ ПРАГА

Мне зразумела гэта цяга —
Пракласці ў полі баразну,
Адвечная святая прага —
Засеяць на свой лад вясну.

Спакой сялянскі ва ўяўленні —
Усё паспець у час зрабіць,
Што ўсё сабранае насенне
Прачнуцца зможа і ажыць.

З нас кожны сее сваё поле,
І не стамляецца рука,
Калі вядзе дабро і воля
Стваральніка — чараўніка.

ВЫСОКАЕ СЛОВА

Высокае слова. Каму яно трэба,
Каму немагчыма пражыць без яго?
Пра гэта пытаю высокае неба,
Пра гэта пытаю ў сумлення свайго.

Няхай не адразу адкажуць дакладна,—
Жыццё дапаможа акрэсліць адказ.
Ёсць слова, якому заўжды падуладна
Істотнае самае, лепшае ў нас.

Высокае — значыць у радасці, ў горы
Ніколі не знае нідзе перашкод.
Высокае сонца, высокія горы
І думкі арлінай высокі палёт.

Каму вышыня перашкодзіла ў шчасці,
Каго не акрыліць, не ўзніме любоў?
А той, каму здарыцца раптам упасці,
Як знічка ўначы, будзе падаць без слоў.

Высокае слова, як сцяг для народа,
Яно не даруе ні ганьбы, ні плям.
Высокае слова для ўсіх неабходна,
Калі яго сэнс не з будзённых рэклам.

ІДУ ДА ЛЮДЗЕЙ

Ніне Мацяш

Ні многа ні мала,
А некалькі слоў
Вясна праспявала,
Як некалі зноў.

Ні многа ні мала,
Мне восень дала
Часцінку свайго
Залатога святла.

І раптам — такі
Далягляд прада мной,
Што ўсё не змясціць,
Не асіліць адной.

Разматваю нізкі
Дарог і падзей.
Шукаю мне блізкіх,
Іду да людзей.

ВЫТОКІ

Сінія азёры
З пікамі асок.
Усплываюць зоры
Ў невадзе аблок.
Цішынёй сасновай
Лечаць тут здаўна.
Тут даецца слову
Сіла, навіна.
Тут мае вытокі
Шчасця, дабрыні.
Ў мудрасці глыбокай —
Продкаў карані.

РОЗДУМ

Не ведала ні клопатаў, ні гора,
Прасіла ў чайкі лёгкага крыла.
Такой была я ўчора, толькі ўчора,
А сёння дзіўна, што такой была.

Няўжо магла я жыць так бестрывожна,
Калі нішто не раніць, не пячэ.
І не адчуць, як боль бездапаможна
Глядзіць з чужых, азмрочаных вачэй.

Няўжо ўсур'ёз магла шукаць мяжу
Між ценямі і сонечным кіпеннем,
Калі ў жыцці адзінаму служу —
Паўнейшым быць яго увасабленнем.

УПЕРШЫНЮ

Вясна прыходзіць кожны раз
Як адкрыццё, як нечаканасць.
І кожны раз здзіўляе нас
Яе дыхання ўсхваляванасць.

Хоць, можа, гэта ўсё было
У непаўторным нейкім годзе,
Ды толькі зноў яе святло
У сэрцы радасцю ўзыходзіць.

Як ні паверыць зноў і зноў,
Што не было яшчэ былога,
Што паміж слоў і паміж сноў
Не адбывалася нічога.

Усё, усё — упершыню!
Такому дню не паўтарыцца.
І толькі ў неба чысціню
Пралеска першая глядзіцца.

* * *

Я ўсё не тое гавару, што трэба,
Перабіраю безліч розных слоў.
О, колькі у цябе адценняў, неба,
О, колькі ў цябе колераў, любоў!

Нахмуранасць і высветленасць даляў,
Вясенні ўсплеск і подых навальніц,
Адкуль такую музыку вы ўзялі,
З якіх зямных прабіліся крыніц?

Я разам з вамі згіну і з'яўлюся,
Адкрыю вельмі многае ў жыцці,
І толькі аднаму не надзіўлюся,
Што слоў такіх, як трэба, не знайсці.

* * *

Вясна звіла так многа гнёзд
І ўсе іх сонцам асвятліла.
Якая радасная сіла
У юнай зелені бяроз!

Вясны нястомнае святло
Ва ўсё ўліваецца імкліва,
Яно на шчасце і на дзіва
У кожным сэрцы расцвіло.
Агонь вясны — ён самы вечны.
Зямлі і неба светлы дар.
Яго нягаснучы пажар —
Над кожным лёсам чалавечым.

РОСЬ

У вузенькай рачулкі Рось
Гасцей заўсёды многа ёсць,
А ў дзень спякоты асабліва
Яна ўся свеціцца шчаслівa
І запрашае ўсіх, як можа,
Да берагоў сваіх мурожных,
Дзе так пятляе адмыслова,
Што здзівіць нават рыбалова,
Дзе пад цяністаю вярбою
Ў вадзе любуюцца сабою
То жоўты люцік, то рамонкі,
То смолак вогненныя гронкі.
...Як многа іх, такіх рачулак,
З дзяцінства дараць нам прытулак,
Спакоем вабяць і мігценнем,
Ды траў някошаных цвіценнем.
Зямля. Радзіма. Гэтых слоў
Не паўтаралі б зноў і зноў

З такой любоўю, каб не клікаў
Той свет, які сышоўся клінам
На ціхай рэчцы, на вярбе,
Што ўспамінаюцца ў журбе
І неадступна ў светлых снах
Нас у жаданы клічуць шлях
Праз мноства пройдзеных дарог
На самы сонечны парог.

* * *

Сакрэт паэтычнага слова...
У чым заключаецца ён?
Ці ў тым, што для кожнага новы
І сэнс у яго, і закон?
А можа, у тым яго сіла,
Што рэдка ўдаецца адкрыць,
Што як бы пяро ні мудрыла,
А слова не здолее жыць.

Не выручаць думка і рыфма,
І тэмы мадней шай канва,
І нават дабрэйшая німфа
Бяссільная ў гэтым сама.

Усё ў ім размечана строга,
Нібы на далоні відно,
Таму і ніколі чужога
Не зможа прысвоіць яно.

ГЛЫБІНЯ

«Я»,— гэта вымавіла я,
Ды зразумець не зразумела,
Чаму драмала глыбіня,
А мітусня бяздумна пела.
За ёй, як быццам за сцяной,
Усё найлепшае маўчала.
Шукала я сябе самой,
Шукала і не спазнавала.

Нічога не адкрыла я
Ні гэтым днём, ні гэтай ноччу.
Але зірнула глыбіня,
Як лепшы сябра, прама ў вочы.

Так у праменнях і расе
Сябе нарэшце ўбачыць ранне:
Хто ты, хто я і хто мы ўсе,
Што нашы справы і жаданні?!

І абудзілася ад сну
Глыбінь нязведаных аснова,
Каб я сябе, сваю вясну
І ўсё убачыла нанова.

МАЁ, НАЙЛЕПШАЕ НА СВЕЦЕ

Доўгачаканая сустрэча!
Як вочы лета — васількі,
Як рукі сябра — цёплы вецер,
Як песня маці — спеў ракі.

На кожнай сцежцы тут — па ўсмешцы,
На кожным кроку тут — паклон.
Усё сваё мне ў гэтым месцы,
І я свая ўсім з даўніх дзён.
Маё, найлепшае на свеце,
Дзе ўсе змяшаліся часы.
У іх дзяцінства промні свецяць,
У іх юнацтва галасы.

Іду, іду і не стамлюся,
І прыпыніцца не хачу,
На крылах радасці імчуся,
Насустрач радасці лячу.

Ці не таму з дарогі кожнай
Нас кліча гэтак родны край,
Якому з нас ніхто не зможа
Сказаць апошняе бывай.

ЯК РЭЧКА СВЕТЛАЯ

Берштаўскаму
народнаму ансамблю

Адкуль жа песеннасць такая
У кожнай вёскі і двара,
Што гэтак хораша кранае,
Нібы вясенняя пара?

Непадуладная стагоддзям,
Душа народная жыве,
Як сонца яснае ўзыходзіць,
Як рэчка светлая плыве.

Як ціхі сон, як вочы родных,
Нясе спакой і цеплыню,
Плыве шырока і свабодна
Насустрач будучаму дню.

Самой прыродай даравана,
Яна заўсёды сярод нас.
...Ой, рана-рана на Івана
Ёй нарадзіцца выпаў час.

* * *

Хоць дні мае, як некалі, цвітуць,
Ды лепшая іх кветка абляцела,
Я ж не паспела нават зазірнуць
У кожны з іх уважліва і смела.

Іх боль, іх голас б'юцца сёння ў скронь,
Іх хваляй захлынулася ўсё сэрца,
Гарыць кляноў нягаснучы агонь,
І тонкім срэбрам павуцінне ўецца.

А хутка закурлычуць журавы
У шэрым апусцелым паднябессі,
І голас іх адклікнецца жывы
Маёй шчаслівай, недапетай песні.

Куды яны спяшаюцца, куды,
У далячынь якую такірвуцца?
І, можа, то ляцяць не журавы,
А дні мае, якім больш не вярнуцца.

* * *

Сіняй птушкай узаўецца
Сон-трава з глыбінь зямных,
Быццам іх жывое сэрца
Расцвіце для рук маіх.

Той давер бездапаможны,
Як хвалюючы сакрэт,
Абнадзейна растрывожыць
Паўзабыты, даўні след.

І травінкамі ўспаміны
Загарацца з-пад снягоў,
Нібы вернуцца хвіліны,
У якіх цвіце любоў.

* * *

А памятаеш, мы з табой шукалі
Чаромху між бяскрайнасці вясны.
Скажы, ці набягаюць белай хваляй
На бераг твой чаромхавыя сны?

Там салаўі на досвітку ружовым
Здзіўляюць пераліўнасцю ладоў.
За кожным рухам і за кожным словам —
Як вечнасць — наша юная любоў.

А памятаеш першую лістоту
Над гнуткасцю захмеленых бяроз,
Дзе нас з табой па-змоўніцку і ўпотай
Амаль штодзень шчасліва зводзіў лёс?

Ва ўсім, ва ўсім было так многа сонца!
Шумелі ліўні радасцю густой,
І верылі мы, што жыццё — бясконца,
Што — ні хвіліны шэрай ці пустой.

І вось не памыліліся нікольні:
Юнацтва не старэе ні на год,
Яно ўступае сваё месца толькі,
Як хуткай плыні звонкі крыгаход.

Яно у нас і з намі застаецца,
І чым далей — тым толькі даражэй.
«А памятаеш?» — гэта ў нашых сэрцах.
«А памятаеш?..» — што яшчэ бліжэй!

УЗЛЁТНАЕ СВІТАННЕ

Лятаць, лятаць — адзінае жаданне,
Перад якім усё — на дальні план,
Прыйшло яно, узлётнае світанне,
Паклікаў прамяністы акіян.

А вышыня, якой душа хварэла,
Імкліва рвецца пад тваё крыло,
І бачу я цябе хмурынкай белай,
Каля якой сто сонцаў усплыло.

Хоць за табой імчуся ва ўяўленні —
Губляецца ў бясконцасці пагляд.
Калі ж, калі шчаслівае імгненне
Нарэшце прынясе цябе назад!

Зямля ўся захлынецца у адчаі,
Скаваная арбітаю крутой,
Пакуль са мной, спусцелая, чакае
Такой трывожна гулкай нематой.

* * *

Ёсць у народзе павер'е:
Песня прыходзіць да тых,
Дзе узыходзіць, як зерне,
Ціхая радасць дваіх.

Не засмуціць свайго шчасця
Словам нядобрых вачэй.
Песню стараюся скласці
Звонкага ранняя званчэй.

Зблізіць нас можа і ростань,
Толькі няхай без яе
Белыя зімы і вёсны
Радасць кахання пяе.

* * *

...І нізкае сонца над белаю беллю снягоў
Рассыпле шчаслівыя ўсмешкі, як золата.
І раптам у сэрцы узыдзе любоў,
Заб'ецца надзея ў ім лёгка і молада.

І як сум, як нявер'е — нуда, неспакой
Растануць бясследна, нібы выпадковыя
Хтось зніме нягоды чароўнай рукой,
І блісне дарога шчаслівай падковаю.

ГАЛОЎНЫ ВЕРШ

Галоўны верш мой, за табой вятры
Нясуць мяне па ўсіх дарогах свету.
І ўсё часцей мне верыцца, што ты
І сам спяшаеш на сустрэчу гэту.

То ў жураўліным прамільгнеш ключы,
То ападзеш сняжынкай на далоні,
То скажаш: стань, паслухай, памаўчы
І раным-рана прачынайся сёння.

Цябе шукаю ў кожным новым дні,
У позірках, у словах і падзеях,
Але знаходжу доказы адны,
Што на сустрэчу можа быць надзея.

Ты час ад часу прывітанне шлеш
Скупымі і нясмелымі радкамі.
А можа, ты пры мне даўно жывеш,
А недавер стаіць мой паміж намі.

4 Зак. 1108

РАДАСЦЬ

Яшчэ прадчуваннем, чаканнем
Няясна паліла душу,
А сёння ва ўсім сваім ззянні
Нахлынула: вось я, прашу.

Вазьмі, я з табою навекі,
Вазьмі ды надзейна трымай.
І шчырай слязінкай на вейкі
Упаў яе сонечны май.

Была яна ўся трапяткая,
Як жаўранак сіняй вясной,
О, радасць, няўжо ты такая,
Няўжо застанешся са мной?

Паверыць? А як не паверыць,
Калі яна побач, сама.
Яна ж не караблік з паперы,
Які прамільгне — і няма.

Мне даль без канца і без краю
Гаворыць, што гэта не сон.
Шчаслівa і лёгка ўзлятаю
І чую... будзільніка звон.

* * *

Туды, дзе сонечна, бязмежна
Зноў адплыве за небакрай
Мой дзень, пражыты незалежна,
І я скажу яму: бывай.

Яшчэ трымаюць яго промні
На тонкім ключыку — струне.
Прыціхлі хвалі: помні, помні
Усё, што зведала раней.

* * *

Калі прыходзяць словы самі,
Іх трэба ў сэрцы зберагчы,
А мы губляем іх між снамі
І не шкадуем ні аб чым.

Абдумаць іх бы, прыпыніцца,
З палону вызваліць душу.
Мінаюць дні, і толькі сніцца,
Што словы тыя — напішу.

АДРАСЫ ШЧАСЦЯ

Там галасы вясны і лета,
Там галасы, іх галасы,
Як многа ў іх маіх сакрэтаў,
Як многа сонца і расы.

Яны плывуць па ціхім лузе,
Па задумёных верасах.
Жывыя дні, жывыя людзі
У тых шчаслівых галасах.

Між гронак бэзу і каліны
Звіняць дасвеццем салаўі.
А ў сэрцы ўсе яны — адзіны,
Спяваюць голасам зямлі.

Там галасы травы і лесу,
Там галасы вясны і лета.
Там дарагія галасы,
Якая песня імі спета,
Якога шчасця адрасы!

ПРЫЗНАННЕ

Ці не з гукаў і колераў
Выплываюць паволі
Тыя словы, каторыя
Дамагаюцца волі.
Прабіваюцца, смелыя:
«Дай нам поўнае выйсце.
Мы на сэрцы збалелыя,
Як асенняе лісце.
Так у новым свячэнні
Пачынаецца ранне.
Мы тваё аблягчэнне.
І тваё прадчуванне.
Вымярай нас адлегласцю,
Лёсам і часам.
Мы жывой супрацьлегласцю
Раптам выльемся разам».

* * *

Не сказана нічога.
Ніякіх быццам змен,
Але глядзіць трывога
З ўсіх куткоў і сцен.

Нічога не пытаю,
Маўчанне апячэ,
Хоць, можа, не стрымаю
Я «голасу» вачэй.

Не сказана нічога.
Стаяла цішыня,
А колькі, колькі многа
У ёй пачула я!

* * *

Хоць і ў снежным акружэнні
Тыя ўзгоркі — астравы,
Палымнее адраджэнне
Першай кветкі і травы.

Так і ў нас у сэрцах штосьці
Так ірвецца — не стрымаць,
Каб з крылатым першым госцем
Бесклапотна заспяваць.

* * *

Ёсць розны дзень,
Ёсць розны свет,
І ўсе яны жаданыя.
А за якім пайсці мне ўслед
Рашаю раным-рана я.
Сцяжынка згубіцца — ледзь-ледзь
Яе заўважыць здолею.
Дні абступаюць, нібы лес,
Няўжо назваць іх доляю.
Няўжо згубіцца сярод іх,
Змірыцца, як зміраюцца,
Калі ад лепшых мар сваіх
Тужліва адракаюцца?
Не адрачыся ад сябе,
Ад часу свайго жніўнага,
І ў запаволенай журбе
Больш не чакаць нязбыўнага.
Хоць і не выпадзе знайсці
Усё найзапаветнае,
А трэба верыць ды ісці,
Пакуль зямля асветлена.

* * *

Усе мы зямныя істоты,
Хоць мала нам толькі зямлі.
Штодзень узлятаюць пілоты,
І ў моры плывуць караблі.

Як трэба ўсё зведаць і змераць,
Адчуць, параўнаць і знайсці!

Не хочацца толькі паверыць,
Што шлях наш — не вечны ў жыцці.

Магчымасці нашы такія,—
У марах ім цесна і ў снах.
Хаця мы істоты зямныя,
Ды кліча галактык размах.

Зямля нам дарогі пакажа,
Каб кожны з нас шчасце спаткаў,
Таму гэтак многа адважных,
Таму гэтак многа ў нас спраў.

* * *

Я разумею, разумею —
Нічога вечнага няма.
Чым бачу больш і разумнею,
Тым супярэчлівей сама.

Таму складаней з кожным крокам
Усё, што бачыцца бліжэй.
Усё пражытае — урокам,
Якi за ўсё найдаражэй.

Няхай жыццё пашле мне шчасце
Не разлюбіць сваіх дарог,
Перад складанасцю не ўпасці
І не пазбавіцца трывог.



Жаночая узнёсласць пачуцця
Шукае у мужчын сабе падтрымку,
Як прагне кожны стомлены прыпынку,
Так месца яна прагне у жыцця.

Будзённая заземленасць і шэрасць,
Як топча яе, шчырую, і гне,
Каханню гэтак неабходна вернасць,
Як сонца надыходзячай вясне.

Я з рук тваіх ізноў бяру букет
І не магу тваім вачам не верыць.
А што такое прыгажосць і веліч,
Калі не наш з табой адзіны свет?



Вечнай радасці б'юць ключы
У крыніцах з жывой вадой.
Маладзік над зямлёй маўчыць,
Заварожаны цішынёй.
Далячыні, якіх не ўявіць,
Маякі, да якіх не даплыць,
Таямнічы касмічны шлях,
Пераплецены ў сініх снах.
Хай адсюль, можа, толькі крок
Да фантазіі смелых чар,
Гэта праўда, што тут выток
Лепшых песень і лепшых мар.

* * *

Не шкадуе раз'юшаны вецер
Ні бяроз, ні дрыготкіх асін...
Колькі сумных мелодый на свеце,
Колькі горкіх, пакутных хвілін.

Аб адным іх прашу: абмініце,
Не пакіньце на сэрцы слядоў,
Не рунейце ад восені ў жыцце
Аж да самых нямых халадоў.

Ападзіце, як спелыя слівы,
На густую траву за сяло,
Каб маглі мы ўсміхнуцца шчасліва
І паверыць, што вас не было.

* * *

О гонар мой! Абарані ў каторы раз
Ад нечых крыўдных і нядобрых фраз,
Ад нечых памылковых меркаванняў,
Не дапусці да самашкадавання.

Пакінь мне веру і гарэнне дай,
І што рабіць, і як рабіць — парай,
Каб не было ні зайздрасці, ні зла,
Каб, як раней, даверлівасць цвіла.

* * *

Ты — адкрыты мною свет,
За табой іду я ўслед,
Каб пранесці сваю радасць
Праз стагоддзі і сусвет.

Ты крыло маё і ўзлёт,
Ты мой захад, мой і ўсход,
Ад цябе бярэ пачатак
Кожны дзень і кожны год.

Як ракіта над вадой,
Я хілюся над табой,
Я дзялюся з табой шчыра
Сваёй радасцю — бядой.

СПОВЕДЗЬ ДЗЯДАМ

Штосьці значу і я
У гэтым шуме і гаме,
У гэтых вечных, бясконцых
Дарогах-шляхах.
Калі трэба,
Калі неабходна я маме,
Значыць гэта — глыбей яшчэ,
Недзе ў дзядах.

Іх спрадвечнае, лепшае
Мушу я выказаць,
Перадаць у надзейныя рукі
Іх дар...

І пражыць не бясследна,
А ў спрэчках і рызыцы
Зберагчы незаплямлены,
Родны іх твар.

ЖЫВЫ ДЗЕНЬ

Не надзівіцца мне, які ты,
Наколькі лепшы за ўсе сны,
Мой дзень, паветрана-блакітны
У лёгкай зелені вясны.

О, як жа радавацца ўмеюць
У промнях белыя сады,
Як заварожаць і захмеляць
Сваім дыханнем маладым.

Жыве, жыве усё навокал
Імкліва, прагна, ў поўны рост.
З надзеяй светлай і высокай
Так пераплёўся цесна лёс.

І нават цені пра няўдачу
Не прамільгне нідзе, ні ў чым.
Парывам шчырым і гарачым
Прызыўна кліча далячынь.

І я іду, і я паверу,
Што толькі сёння, ўпершыню
Вясна адкрыла гэты бераг,
А неба — шчасця вышыню.

* * *

А мне і сёння часта сніцца
І вабіць вечнаю вясной
Мая гаючая крыніца
Пад задумёнаю сасной.

Там мудрай вечнасці вытокі,
А слова кожнае — пяе.
Патрэбна зоркай стаць высокай,
Каб далучыцца да яе.

Там даль палёў, лясныя ўзгоркі,
Як сведкі памятных падзей,
І загараюцца, як зоркі,
Імёны светлыя людзей.

* * *

Калі на голас стоенай струны
Удача гляне шчырымі вачыма,—
Нахлыне прадчуванне навізны,
Што раптам немагчымае — магчыма.

Устрапянецца з самай глыбіні
Усё, што дрэмле невядомай сілай.
А ў сонцы раннім — мора цеплыні,
А ў небе — маладыя нашы крылы.

Паверыцца, што трэба найхутчэй
Спяшацца да задуманае мэты.
Паверыцца, і заблішчыць ярчэй
Жаданейшая зорка над планетай.



Дзень мой бязвоблачны, светлае ранне,
Дзе ж ты цяпер мне прызначыш спатканне,
Дзе я сустрэнуся з тымі вачамі,
Каб пра каханне расказвалі самі?

Не паўтарыцца, не паўтарыцца
Лепшаму дню, што не зможа забыцца,
Стане ён памяццю, песнямі стане,
Сном каляровым шчасліва прагляне...

Не паўтарыцца, не паўтарыцца
Лепшаму дню, што не зможа забыцца.
Хай жа не будуць адзінымі ў нас
Дні, што прыходзяць адзін толькі раз.



Не валасамі русалкі —
Косамі белых родных бяроз,
Зачараваная змалку,
Пераплятаю свой лёс.

Хай не ў акне, а ў канверце
З роднай бярозы лісток,
Дом, дзе жыве маё сэрца,—
Шчасця і мары выток.

Там, сярод цёплага маю,
Ў ціхім здзіўленні стаю,
Быццам у хвалі, ныраю
Ў светлую памяць тваю.

Летняя песня калосся,
Восеньскі спеў жураvoў...
Ці ж не адсюль пачалося
Вечнае слова Любоў?!

* * *

Пачынаецца ўсё з вясны:
І надзеі, і захапленне.
Абуджаюцца мары-сны,
Як глыбока ў зямлі — карэнне.

Абуджаецца пакрысе
Цэлы свет, гаманкі ды сіні.
Напаўняюцца сэрцы ўсе
Таямнічай вялікай сілай.

Неабдымны, шчаслівы край,
Поўны гукаў і летуцення.
Адчыняе зялёны май
Таямніцы свайго цвіцення.

* * *

Нават радасць і сум,
Як сустрэчы і ростань,
Прывыкаем лічыць
То нязначным, то простым.

Да ўсяго прывыкаем,
А вечнасць — не вечная,
Не бясконцае наша
Жыццё чалавечае.
І калі журавамі
Ў далёкія далі
Паляцім ці асыплемся
Лісцем на хвалі,—
Застануцца ад нас
Наша радасць і гора,
Нашы сцежкі-шляхі,
Нашы сёння і ўчора,
Не, зусім незвычайна,
Не проста, не проста
Так прызыўна вясна
Сваёй шчодрасцю роснай.
І як нельга прывыкнуць
Да ростані з блізкім,
Так не стане святое, высокае —
Нізкім.
Не бывае нязначнага,
Простага, дробнага.
Ёсць сляды і часцінкі
Адвечнага, роднага.

* * *

Ты скажы мне, шчырая рабіна,
Колькі песень чула на вяку,
Як тужыла горкай сірацінаю,
Як цвіла пад вокнамі ў садку.

А ці ж я таксама не такая?
У мяне такі ж няроўны лёс:
То адна, самотная, чакаю
І ў адчаі не хапаю слёз.

То шчаслівая выйду на сустрэчу,—
Сэрца перапоўнена вясной,
І паверу, што нарэшце вечна
Шчасце неразлучнае са мной.

Адгарацъ рабінавыя гронкі
У прыватным восеньскім агні.
Лёс жанчыны. Светлы ён ці горкі,
А прыносіць сонечныя дні.

ТАКІ НАШ ВЕК

Такі наш век — спакой яму не сніцца,
Так хуткасць неадольная расце,
Што нельга на хвіліну прыпыніцца
Ні на адной аддаленай вярсце.

Такі наш век — ён стогне і бушуе,
Няспынна барацьба вакол ідзе,
І ўсё, аб чым цяпер ні напішу я,—
Праз дзве гадзіны — нібы даўні дзень.

Змагаемся за нашу незалежнасць,
Імкнемся абагнаць імклівы час,
А барацьбы нялёгкай непазбежнасць
Яшчэ напомніць пра сябе не раз.

Яна ідзе нястомна і нябачна,
І вораг не заўсёды на віду,
Я ад сваіх няўдач даўно не плачу,
Я кожны дзень з-за іх «на вы» іду.

СУСТРЭЧА Ў ШКОЛЕ

Шэсць сыноў пазірае з партрэтаў,
Іх і сёння чакаеш з вайны,
Без папроку, што цэламу свету
Не скупіць сваёй горкай віны.

...Бачыш, колькі сабралася ўнукаў,
Палічы і ўсміхніся — твае,
Хоць нікога не брала на рукі
І ва ўсіх ёсць бабулі свае.

І не снілася нават такое,
Не магла аб такім і гадаць,
Цётка Ганна, навошта ж рукою
Ты слязінку спрабуеш схаваць?

* * *

Поўны сонца пералесак,—
Гэта сонейка — святло
З самай раніцы над лесам
Сушыць сіняе крыло.

Кожны ліст зялёнай мрояй
Загараецца здалёк,
Быццам крылле трапяткое
Грэе лёгкі матылёк.

Ёсць мастак, адзіны ў свеце,
І яго шчаслівы дар;
Толькі ён на ўсёй планеце
Светамузыкі ўладар.

Так іскрыцца, так спявае,
Аж здзіўляецца зямля:
Сонца-сонейка, жывая
Светамузыка твая!

Служыць шчыра чалавеку
Кожным летам і зімой,
Сонца-сонейка, навекі
Неўміручы талент твой.

* * *

У чым вясенніх чар сакрэт,
Яе натхняючая сіла,
Чаму мяняецца сусвет
І за спіной як быццам крылы?

Ад першых кветак — белы лес,
Яны, як зоркі, шчодрай жменяй

Імкнуцца край бясконцы ўвесь
Аздобіць сотнямі адценняў.

А там лясныя спевакі
Такія падбіраюць ноты,
Што забываеш на вякі
Непажаданыя турботы.

І ўжо не хочацца мудрыць,
Чаму, адкуль ды што такое?!
А, як сама прырода, піць
Вясну і сонца маладое.

ПЕСНІ ПОЛЯ

Засяваюць поле жаўрукі
Песнямі срабрыстымі, натхнёнымі,
Жаўрукі і песні — сваякі,
На вякі і праз вякі зраднёныя.

Хлеб без песні нельга і ўявіць,
А без хлеба песня не спяваецца.
Як яна, шчаслівая, звініць,
Калі сокам колас наліваецца!

І зямля, як чуйная рука,
Ледзь кранi — здзіўляе таямніцамі.
Песні поля — песні жаўрука
Над яе спрадвечнымі крыніцамі.

УСПАМІН

То, вядома, не сон:
Толькі вочы прыкрыю,—
Вось ён, бераг, пясок,
Чайкі ўзмах белакрылы.

Серабрысты прыбой
Адступае за сонцам
І вядзе нас з табой
Далячынню бясконцай.

А над морам — пажар
Ад апошніх праменняў...
Край няспраўджаных мар,
Край сляпых летуценняў!

Не збылося. Аднак
Не згарэла, як знічка,
Сярод ночы ці дня
Раптам ціха пакліча.

Цёплы бераг, пясок,
Лёгкай хвалі напеўнасць.
Самы светлы мой сон,
Дзе ўладарыць таемнасць.

* * *

Я дні і ночы так цябе чакала,
Я дні і ночы толькі тым жыла,
Што ў памяці ўвесь час перабірала
Імгненні твайго дзіўнага святла.

О, колькі слоў паспела нарадзіцца,
О, колькі слоў паспела адцвісці!
І ўсё ж чакання вечнага крыніца
Не вечнай аказалася ў жыцці.

Разгублена ўслухаюся ў маўчанне,
Дзе ж словы ўсе найлепшыя мае?
Я іх знайшла за час свайго чакання,
А сёння ім чагосьці не стае.

Не тыя словы і не тыя вочы,
Як ні глядзі — былога не вярнуць,
І толькі памяць зразумець не хоча,
Што восенню пралескі не цвітуць...

* * *

Ні ў думках і ні снах не абмінуць
Тваіх дарог, тваіх гарачых слоў.
Ва ўсім яны, шчаслівыя, жывуць,
Ва ўсім знаходжу я іх зноў і зноў.

Гучыць твой голас, як і ў першым дні,
Цвіце твой сад, і падае твой снег,
І нават у вячэрняй цішыні
Са мной гаворыць твой далёкі след.

Я спазнаю цябе, я спазнаю,
Як светлячкі, гараць твае сляды,
І веру неадступную маю
Нясуць праз дні, праз ночы.
Праз гады.

* * *

Што не збылося, што не збылося,
З марай далёкай пераплялося.
Раптам нахлыне, раптам параніць,
Ускалыхнецца горкая памяць.

Як жа завяла шчаслівая кветка,
Можа, яе палівала я рэдка.
Ці пра яе не заўсёды я дбала,
Ці клапацілася, можа, замала?

Ды не змірыцца, не, не змірыцца,
Што маёй мары так і не збыцца,
Толькі ўсё верыцца — быць той хвіліне,
Што без удачы мяне не пакіне.

Збудзецца, збудзецца. Птушкай крылатай
Сэрца чакае гэтага свята.

* * *

Восень загараецца рабінамі,
Золатам бярозавых завей.
І ляціць клінамі жураўлінымі
Ад зямлі засмучанай далей.
Затрымаць дарэмна намагаюцца
Павуцінай тонкай верасы,
Толькі рэхам гулкім адклікаюцца
Ціхія спусцелыя лясы.

Кліч не кліч — назад яна не вернецца,
Хоць сумуй, хоць не сумуй, на жаль,
Дагарыць халодным хмурным вераснем
Сэрца яе чуйнага пажар.

І застыне тонкімі ільдзінкамі
На срабрыстых вейках у азёр,
А затым рассыплецца сняжынкамі
На збялелы, закаваны дол.

* * *

І першы крык, і першы крок —
Усё для кожнага — спачатку.
А што жыццё? Суцэльны ўрок,
Дзе ні мінуты на аглядку?

У глыбіні пражытых дзён —
Пачатак роздуму і веры.
Уласны вопыт, толькі ён
Сапраўднай ісціны крытэрый.

* * *

Я не пісала б вершаў, не,
Калі б яны, жывыя, самі
Не напаўнялі сэрца мне
Хвалюючымі галасамі.

Я не пісала б вершаў, не,
І без мяне іх пішуць многа,
Але мільгаюць яны ў сне
То ціхай песняй, то трывогай.

І, дзіўна, з імі мне святлей,
Лягчэй ісці і бачыць мэту.
Жыві, мой верш, і сэрца грэй,
Будзь, як і мне, патрэбным свету!

* * *

Дажджы, дажджы над Руссю Белай
Грыбныя, цёплыя, густыя,
Дзе па начах туман самлелы
Дубы вартуе векавыя.
А недзе там, за жытнім полем,
За роснай сцежачкай срабрыстай,
Праб'ецца досвітак на волю
Птушынай песняй галасістай,
І выйдзе з хаты, усміхнецца
Дзяўчына самай лепшай долі:
«Скажы, а як табе жывецца
Замест мяне ў бацькоўскім доме?
Скажы, ці помняць лес, дарога
Сцяжынкі ўсе і навальніцы?
Мяне — бягучай, басаногай —
То па грыбы, то па суніцы?»

ХАЙ ДУМАЮЦЬ

Хай думаюць: шчаслівая!
Хай думаюць, хай думаюць.
Падхопіць плынь імклівая
Бяду маю, бяду маю.
Няхай сляза салёная
З вачэй маіх не просіцца,—
Туга з травой зялёнаю
Пакосіцца, пакосіцца.
Мае нягоды з росамі
Пазнікнуць за туманамі,
А сонца над пракосамі
Засвеціць нечаканае.
Бяжыць рака імклівая
І на вачах мяняецца.
Хай думаюць: шчаслівая!
Відаць, не памыляюцца.

РЭДКАЯ ХВІЛІНА

Святлом дабра і шчырай думкі
На сэрца ляжа цішыня,
Як адмысловыя карункі
Калісьці пройдзенага дня.
Тугі і радасці выснова
У глыбіні яе нямой,
Таму ні музыкай, ні словам
Не перадаць хвіліны той.
Збылося што і не збылося,
І ўсё, што споўніцца яшчэ,—
Па-чалавечы ў ёй злілося
І, невыказнае, цячэ.

Маўчанню толькі зразумелы
Яе і веліч, і сакрэт,
Адкуль агеньчыкам нясмелым
Глядзіць глыбіннае на свет.

* * *

Як набліжэнне да роднай душы,
Песня вачэй тваіх сініх
Век хваляваць не пакіне,
Хоць ні аб чым не кажы.
Хоць і надарыцца час —
Слова адчуе патрэбу,
Толькі вачэй нашых неба
Будзе галоўным для нас.
Я і без слоў разумею
Думак тваіх глыбіню,
Дзе расцвітае лілея
Белым праменнем агню.

БЕЛЫ МАЙ

Іграй, іграй, мой белы май,
І музыкай, і словамі.
Не замаўкай, не ападай
Пялёсткамі вішнёвымі.

Хай колькі дзён, хай колькі год
Не адаб'ецца ў памяці,—
Мая акрыленасць, узлёт —
З тваёй садовай замеці.

Глядзі мне ўслед, ідзі за мной,—
Я буду шчаслівейшая,
І назаўсёды будзь са мной,
Хвіліна даражэйшая.

Гары, гары, не дагарай
І стань маімі песнямі
Пра родны дом, пра родны край,
Пра ўсё, што ў сэрцы весняе.

ЗОРКІ НА ПОМНІКУ

Дзень пачаўся па-летняму радасна, звонка,
Заірдзеліся росы на безліч ладоў,
Паплылі над зямлёй пералівіста-тонка
Пераклічкі птушыных зялёных садоў.
І расправіў бутон свае крыльцы — сапрана,
Нібы ранняе сонца ці вогненны сцяг
Загарэўся.
...Ды раптам слязой нечаканай
Скамянеў і забіўся тужліва ў грудзях:
Да высокага помніка ў нізкім паклоне
Незнаёмка паклала чырвоны букет,
Апусціла бязгучна свой твар у далоні,—
І на міг анямеў, пацямнеў белы свет.
Незлічоныя зоркі на помніку гэтым
На вякі упісаліся ў сотні імён.
Іх трывожным святлом асвятлілі планету,
І зірнулі вачамі іх жудасных дзён...
Запынілася сонца ў хвіліне маўчання,
І чаму, зразумела, напэўна, і так,
Асыпалася росамі светлае ранне
І пякучымі крыльцамі — вогненны мак.

ВЯСНА — АДНА НА ЎСІХ

Санеты

I

Як верыла калісьці, як цвіло
Тваё незамаркочанае неба!
Каб быць шчаслівай — многага не трэба,
А ўсё, чаго хацелася, было.
Яшчэ сакрэтаў не адкрыла глеба,—
Сем вёснаў завітала на парог,
І быў, як бог, жаданым дзед Цімох
З яго акрайцам пастуховым хлеба.
О гэты хлеб! Ён смачны быў такі,
Што з прагнасцю сачылі хлапчукі
І паспытаць спяшаліся хутчэй.
Ты разам з імі бегла ў белы свет,
А радасць аж свяцілася з вачэй
І ў сэрцы пакідала першы след.

II

І ў сэрцы пакідала першы след
З даверам да жыцця і да людзей,
У прадчуванні значнасці падзей
Вучыла цвёрда бацькаў запавет:
«Ні ў чым, нікому не жадай бяды,
Паспачувай, пазыч, дапамажы,
На ўсе пытанні шчыра адкажы,
У працы будзь найпершай заўсягды.
Чужога не бяры і не жадай,
Лепш не даспі, а спраў не адкладай,
Ствары рукамі ўсё, што хочаш мець,
Навучышся ўсяму, што трэба ўмець,
Хто любіць працу — не сядзіць без спраў».

III

Хто любіць працу — не сядзіць без спраў.
І ты адной мінуты не сядзела,
Кудысьці ўсё спяшалася, ляцела,
А дзень юнацтва хутка дагараў.
І вось яно вянком апала белым,
Пярсцёнкам заняволіліся рукі,
І ручнікі ўжо ў хаце у свякрухі,
Дзе ўсё не так, як ты таго хацела.
Расплецена і зблытана каса,
І хатніх спраў бясконцых паласа,
А тут, глядзі, паслаў дачушку бог.
Жвавей, хутчэй круціся ды бяжы,
Не пашкадуй ні сна свайго, ні ног,
На ўсё, што здольна,— справай адкажы.

IV

На ўсё, што здольна,— справай адкажы,
А гора акружала, як чума.
...Ноч. Цемра... І дачушкі больш няма,
Замест яе — халодны крыж.
Уся ў слязах, не ведаеш сама,
Як гэту рану ў сэрцы загаіць.
Яна мацней, чым лютая зіма,
Нясцерпным, вострым холадам смыліць.
Лягчэй паплакаць — не хапае слёз,
Загінуць лепш... І выйшла на мароз.
Бушуйце, злыя зімнія вятры,
І сэрца замарозьце на вякі.
Вазьмі мяне, зіма, з зямлі сатры,
Мне не асіліць горкі лёс такі.

V

Мне не асіліць горкі лёс такі.
А ён, хоць быццам радасці не нёс,
Ды ўсмешкай сына восенню прарос
І прытуліў да матчынай шчакі.
Якая ўцеха шчырая да слёз!
Жыві, матуля, радуйся, гадуй,
Не плач дарэмна, чуеш? Не бядуй,
Лепш клапаціся, каб здаровым рос.
І сонца б пасялілася ў вачах.
Ды зноў бяда зірнула з-за пляча,
Бяда ўсім бедам, як густы палын,
Не ведаючы, у чым была віна.
Ляжаў малы, асірацелы сын —
Забрала бацьку ад яго вайна.

VI

Забрала бацьку ад яго вайна,
І пахаронкай чорнай крумкачы
Ляцелі ў дом, каб сэрца апячы,
А дом згарэў, як свечка, давідна.
Агонь сляпы, не ўмее берагчы,
Жывое ўсё ён нішчыў, нібы воўк,
І, ашалелы, ненажэрны, змоўк,
Каменне на падмуру грызучы.
Стаяла печ адна, як немаўля,
Плыў едкі дым, і плакала зямля
Над папялішчамі дамоў-магіл.
Тут не было прытулку для жывых,
А выжыць трэба. Дзе набрацца сіл
У гэты чорны, самы горкі міг?

VII

У гэты чорны, самы горкі міг,
Дзе мужнасці набралася такой,
Калі трымала цвёрдаю рукой
Асірацелых, кінутых малых?
Па партызанскай сцежцы за ракой,
У векавым, няхоdžаным бары,
У самым недаступным гушчары
Для іх знайшла прытулак і спакой.
...Такіх, як ты, нялёгка палічыць,
Аб тым вайна далёкая маўчыць,
Зямлянкі зараслі даўно травой.
І выспелі суніцы на палянах,
А ты стаіш з бялюткай галавой,
Як некалі, устаўшы раным-рана.

VIII

Як некалі, устаўшы раным-рана,
Цяпер ужо няма куды спяшыць,
Цяпер, калі б магла шчасліва жыць,
Баляць і не даюць спакою раны.
Хатынскі звон, як боль жывы, звініць,
І замірае сэрца, як тады,
У самы-самы дзень сваёй бяды,
Які ніколі нельга ўжо забыць.
Нідзе не адшукала ты слядоў
Праз столькіх ціхіх і нямых гадоў,
Не верыць сэрца, што няма нідзе
Тых, хто загінуў,— не вярнуць назад,
Было б лягчэй, каб бацька паглядзеў
На хлапчука, якому быў так рад.

IX

На хлапчука, якому быў так рад,
Унукаў бы да сэрца прытуліў,
Хоць раз зірнуў на родныя палі,
На грушу ля варот, на белы сад.
Ізноў хвалюе веснавы разліў,
Трава аж зіхаціць на астраўках,
І лашчыць беражлівая рука
Пярсцёнак, што на шчасце ён дарыў,—
Адзінае, што не ўзяла вайна,
І час не астудзіў яго віна.
Калі няма надзейнага крыла,—
Чым адзіноты сум твой разагнаць?
Чым незагойны гэты боль суняць,—
Вясной так сэрцу хочацца цяпла!

X

Вясной так сэрцу хочацца цяпла,
Але душы нічым больш не сагрэць,
Звініць гадоў тваіх нялёгкіх медзь,
Куды, у край які ты заплыла?
Куды і для чаго цяпер ляцець?
У мудрасці, на жаль, няма крыла,
Здаецца, і вясна не адцвіла,
Ды ўжо зіма каля варот мяце.
Дзяўчынка-непаседа, ці ж не ты
Гусей ганяла ў ранак залаты?
Дарогамі сваімі даражыш,
Ды іх не трэба стомленым нагам,
Нікуды не імкнешся, не бяжыш,
Хоць кліча памяць к родным берагам.

XI

Хоць кліча памяць к родным берагам,
Дзе ўсё жыве, пакуль жывая ты,
Святлом прызыўна свеціць маладым
Мурожным далям і яе стагам.
Яе не замарозяць халады,
У памяці такі шчаслівы дар,—
Яна адна — магутнейшы ўладар,
Які спыняе даты і гады
І адшукае дом твой і сяброў,
Паўторыць столькі цёплых, родных слоў.
І распазнае ў іх цябе, сваю,—
Якой калісьці памяталі ўсе.
...Перад табой, няскоранай, стаю,
Жыццё імкліва ўдаль мяне нясе.

XII

Жыццё імкліва ўдаль мяне нясе
І аддае мне ўсе твае дарогі,
Дык сядзем жа ля роднага парога
І шчыра пагаворым аб вясне.
Ты паглядзіш даверліва і строга,—
Вясна — адна на ўсіх нас на вякі.
Яна імчыцца з плаўнасцю ракі,
А пакідае ў памяці так многа,
Перадае сляды і запаветы,
Хаця сама, як абнаўленне свету.
Я прысягну святлу і дабрыні
І ўбачу, што было ўсё недарэмна,
Што, як адны і тыя ж карані,
Бярэ пачатак новы дзень таемна.

XIII

Бярэ пачатак новы дзень таемна,
І зноў мы ўспамінаем, што было,
Што ўчора і заўчора адцвіло,
Што заўтра яшчэ здзівіць нас прыемна,
Што іншых хвалявала і вяло.
На кожны шлях — свае выпрабаванні.
Свае, адваяваныя світанні,
Свой свет — як дом, як горад ці сяло.
Ты зычыш шлях мне мой найлепшы самы,
І трэба пачынаць яго таксама
Ад бацькавай, ад матчынай мяжы,
Гатовай быць да лютых бур і бед,—
Дарэмна нам нічога не даецца.
За добрым чалавекам толькі след
На многія стагоддзі застаецца.

XIV

На многія стагоддзі застаецца
Бацькоўскае, спрадвечнае, святое,
Іх сонца, іх дыханне маладое,
Іх поўнае надзей шчаслівых сэрца.
Яно — над абеліскамі герояў,
Шуміць даспелым коласам на полі,
Яно не дасць спыніцца нам ніколі
Сярод дарог няпройдзеных сувояў —
У іх багацце наша і парывы.
Без бацькаўшчыны хто з нас быў шчаслівы?
Хто мог з чужога голасу запець?
У песні маёй смутак і агонь,
У ёй усё, што неабходна мець,
Як шчырая бацькоўская далонь.

* * *

Як шчырая бацькоўская далонь,
Яна заўсёды кліча нас здалёк:
Як сярод жыта сіні васілёк,
Як срэбра, што лягло бацькам на скронь.
Ці самы першы, непаўторны крок.
...Свой лёс, як плацце, на сябе надзену,
Вазьму з сабой шчаслівую надзею
І знаю — не саб'юся з тых дарог,
Якія нам даверылі дзяды
І пралажылі смела праз гады.
Прыміце ж мой вянок, як пацвярджэнне,
Што недарэмна адцвітае лета.
Што хоць жыццё ўсяго адно імгненне,
А бессмяротны сэнс яго і мэта.

ЗМЕСТ

Мая радзіма — 3
*** Крынічка нясе гаючая... — 3
Бацькоўскае імя — 4
Свіцязь — 5
*** Жыццё і радуе, і кліча... — 5
Зямля мая — 6
*** Зайздрошчу дрэвам, іх развазе... — 7
Імгненне — 7
Маладзік — 8
Белы ветразь — 8
*** А вы мяне паклічце, сосны... — 9
*** Вясны і лета летуценне... — 10
*** Яшчэ спяваюць скрыпкі і кларнеты... — 10
Сляды Чурлёніса — 11
*** Садамі белымі, маўклівымі... — 11
Адвечная прага — 12
Высокае слова — 13
Іду да людзей — 13
Вытокі — 14
Роздум — 15
Упершыню — 15
*** Я ўсё не тое гавару, што трэба... — 16
*** Вясна звіла так многа гнёзд...— 16
Рось — 17
*** Сакрэт паэтычнага слова... — 18
Глыбіня — 19
Маё, найлепшае на свеце — 19
Як рэчка светлая — 20
*** Хоць дні мае... — 21
*** Сіняй птушкай... — 22

*** А памятаеш... — 22
Узлётнае світанне — 23
*** Ёсць у народзе... — 24
*** І нізкае сонца... — 24
Галоўны верш — 25
Радасць — 26
*** Туды, дзе сонечна... — 26
*** Калі прыходзяць словы...— 27
Адрасы шчасця — 27
Прызнанне — 28
*** Не сказана нічога... — 29
*** Хоць і ў снежным акружэнні... — 29
*** Ёсць розны дзень... — 30
*** Усе мы зямныя... — 30
*** Я разумею, разумею... — 31
*** Жаночая узнёсласць... — 32
*** Вечнай радасці... — 32
*** Не шкадуе раз'юшаны вецер... — 33
*** О гонар мой!.. — 33
*** Ты — адкрыты мною свет... — 34
Споведзь дзядам — 34
Жывы дзень — 35
*** А мне і сёння часта сніцца... — 36
*** Калі на голас... — 36
*** Дзень мой бязвоблачны... — 37
*** Не валасамі русалкі... — 37
*** Пачынаецца ўсё... — 38
*** Нават радасць і сум... — 38
*** Ты скажы мне... — 39
Такі наш век — 40
Сустрэча ў школе — 41
*** Поўны сонца пералесак... — 41
*** У чым вясенніх чар сакрэт... — 42
Песні поля — 43
Успамін — 44
*** Я дні і ночы... — 44

*** Ні ў думках і ні ў снах... — 45
*** Што не збылося... — 46
*** Восень загараецца рабінамі... — 46
*** І першы крык... — 47
*** Я не пісала б вершаў... — 47
*** Дажджы, дажджы над Руссю Белай... — 48
Хай думаюць — 49
Рэдкая хвіліна — 49
*** Як набліжэнне да роднай душы... — 50
Белы май — 50
Зоркі на помніку — 51
Вясна — адна на ўсіх (Санеты) — 52

Шаўчонак М.

Ш 29 Бацькоўскае імя: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1981.— 62 с.

20 к.

Імя маладой беларускай паэтэсы Марыі Шаўчонак вядома па яе кніжках вершаў «Белая ластаўка», «Свята зямлі» і інш.

Гэты зборнік — новая справаздача перад чытачом. Паэтэса раскрывае лірычны свет свайго сучасніка, яго імкненні заўсёды быць на ўзроўні часу, актыўна ўдзельнічаць у жыцці.

Ш $\frac{70403-028}{М 302(05)-81}$ 59—81

ББК 84 Бел 7

Бел 2

Мария Силантьевна Шевченок
ОТЦОВСКОЕ ИМЯ
Стихи
Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке
Рэдактар Р. М. Яўсееў. Мастак Л. А. Трэстман. Мастацкі рэдактар А. М. Малышава. Тэхнічныя рэдактары М. Ц. Паппкова, Г. Г. Федарук. Карэктар Л. М. Вайцяшэня.
ІБ № 1023
Здадзена ў набор 03.11.80. Падп. да друку 14.01.81. АТ 06506. Фармат 70×90¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 2,34. Ул.-выд. арк. 2,27.
Тыраж 4000 экз. Зак. 1108. Цана 20 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, Паркавая магістраль, 11. Паліграфкамбінат імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.